Дзьмітры Крат

Зьвесткі зь Вікіпэдыі — вольнай энцыкляпэдыі

Дзьмі́тры Аляксáндравіч Крат (нар. Горлаўка, Данецкая вобласьць, цяпер Украіна) — прапагандыст рэжыму Лукашэнкі ў Беларусі, высокапастаўлены супрацоўнік газэты «Советская Белоруссия».

Дзьмітры Крат	
Дмитрий Александрович Крят	
Род дзейнасьці	прапагандыст
Месца нараджэньня	Горлаўка, Данецкая вобласьць, Украінская ССР, СССР
Узнагароды	(2021) і іншыя

Біяграфія

Нарадзіўся ў Горлаўцы (Украіна), на радзіме бацькі — савецкага вайскоўца-танкіста. Навучаўся ў Горлаўцы, а таксама на расейскім Далёкім усходзе: у Благавешчанску і ў суворaўскай вучэльні ў Усурыйску[1].

У часы СССР паступіў у Менскую вышэйшую ваенна-палітычную агульвайсковую вучэльню, якую скончыў ужо пасьля атрыманьня Беларусьсю незалежнасьці.

З 2000 г. працуе ў газэце «Советская Белоруссия». Пісаў на эканамічныя і палітычныя тэмы, пазьней стаў адным з асноўных журналістаў, што асьвятлялі дзейнасьць Аляксандра Лукашэнкі і рэдактарам аддзела па асьвятленьні дзейнасьці Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь выдавецкага дому «Беларусь сегодня».

У студзені 2021 г. Лукашэнка ўзнагародзіў Крата Мэдалём Францішка Скарыны[2] за «высокі прафэсіяналізм, вялікі асабісты ўклад у развіцьцё дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі і нацыянальнай журналістыкі».

Прафэсійная дзейнасьць, выказваньні, скандалы

Стаў вядомым праз свае агрэсіўныя і непрыстойныя выказваньні пра журналістаў незалежных СМІ[3][4][5].

У 2020 г. займаўся публічнымі спэкуляцыямі наконт нібыта замежных арганізатараў масавых пратэстаў супраць рэжыму А. Лукашэнкі[6]. Абвінавачваўся прадстаўнікамі беларускай дэмакратычнай апазыцыі ў адказнасьці за публікацыю прапагандысцкіх матар'ялаў з скажэньнем інфармацыі, прапаноўваўся да ўключэньня ў санкцыйныя сьпісы[7].

Вясной 2020 г. у агрэсіўнай форме выказваўся адносна крытыкаў лукашэнкаўскай палітыкі датычна пандэміі каранавіруса COVID-19, якая пазьней была прызнаная неэфэктыўнай[8].

Выступаў у абарону рэпрэсіўнага лукашэнкаўскага заканадаўства аб СМІ і адпаведнай правапрымяняльнай практыкі[9].

Займаўся ачарненьнем пратэстнай дзейнасьці беларускай дыяспары[10], Сьвятланы Ціханоўскай, Паўла Латушкі і іншых лідараў дэмакратычнага пратэсту ў выгнаньні[11][12].

Вонкавыя спасылкі

- Публікацыі Дз. Крата (https://www.sb.by/author/153317-dmitriy-kryat/) на сайце газэты «Советская Белоруссия»

Крыніцы

1. ^ Журналісты «Советской Белоруссіі» Дзмітрый Крат і Раман Рудзь, якія радаваліся затрыманню калег, — хто яны такія і адкуль узяліся (https://nn.by/?c=ar&i=214338) — Наша Ніва, 15.08.2018
2. ^ Работнікі сферы сродкаў масавай інфармацыі і камунікацый удастоены дзяржузнагарод (http://president.gov.by/by/news_by/view/rabotniki-sfery-srodkau-masavaj-infarmatsyi-i-kamunikatsyj-udastoeny-dzjarzhuznagarod-25262/) — Афіцыйны інтэрнэт-партал прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, 11 студзеня 2021 г.
3. ^ Пропагандист СБ призвал выслать из страны «никчемную грязь, возомнившую себя прессой» (https://naviny.by/new/20200430/1588230331-propagandist-sb-prizval-vylat-iz-strany-nikchemnuyu-gryaz-vozomnivshuyu) (недаступная спасылка) [Прапагандыст СБ заклікаў выслаць ў краіны «нікчэмны бруд, які палічыў сябе прэсай»] — naviny.by, 30.04.2020
4. ^ Журналист «Советской Белоруссии» назвал Золотову и Коровенкову удобными в быту дамами (https://naviny.by/new/20180808/1533739894-zhurnalist-sovetskoy-belorussii-nazval-zolotovu-i-korovenkovu-udobnymi-v) (недаступная спасылка) [Журналіст «Советской Белоруссии» назваў Золатаву і Каравенкаву зручнымі ў побыце дамамі] — naviny.by, 08.08.2018
5. ^ Журналисты «Советской Белоруссии» предложили использовать пули и огнеметы против коллег из независимых СМИ (https://telegraf.by/politika/zhurnalisty-sovetskoj-belorussii-predlozhili-ispolzovat-puli-i-ognemety-protiv-kolleg-iz-nezavisimyh-smi/) (недаступная спасылка) [Журналісты «Советской Белоруссии» прапанавалі выкарыстоўваць кулі і агнямёты супраць калегаў зь незалежных СМІ] — Telegraf.by, 30.04.2020
6. ^ «Бросают девчонок на ОМОН». Соловьев о целях «женского марша» в Минске (https://radiosputnik.ria.ru/20200830/solovev-1576487809.html) [«Кідаюць дзяўчынаў на АМАП». Салаўёў пра мэты «жаночага маршу» ў Менску] — Sputnik (радыё), 30.08.2020
7. ^ Рекомендованные списки лиц (граждан Беларуси) для введения индивидуальных санкций со стороны Евросоюза (https://nash-dom.info/61339) [Рэкамэндаваныя сьпісы асобаў (грамадзянаў Беларусі) для ўвядзеньня індывідуальных санкцый з боку Эўрапейскага Зьвязу] — Міжнародны цэнтар грамадзянскіх ініцыятываў «Наш дом»
8. ^ Вирус бесстыдства (https://www.sb.by/articles/virus-besstydstva.html) [Вірус бессаромства] — Советская Белоруссия, 15 сакавіка 2020 г.
9. ^ Аляксандар Фядута. Реплика (https://nmnby.eu/news/analytics/60.html) [Рэпліка] — NMNby.eu
10. ^ Как бывшие земляки вредят своей родине (https://www.sb.by/articles/tayny-pauchikh-gnyezd-3.html) [Як былыя землякі шкодзяць сваёй радзіме] - СБ. Беларусь сегодня, 25.03.2021
11. ^ Как бьются за чужие деньги беглые «бунтари» из Беларуси (https://www.sb.by/articles/tayny-pauchikh-gnyezd.html) [Як б'юцца за чужыя грошы зьбеглыя «пратэстоўцы» зь Беларусі] - СБ. Беларусь сегодня, 18.03.2021
12. ^ Как плетется паутина войны (https://www.sb.by/articles/tayny-pauchikh-gnyezd-2.html) - СБ. Беларусь сегодня, 22.03.2021

Атрымана з «https://be-tarask.wikipedia.org/w/index.php?title=Дзьмітры_Крат&oldid=2281558»

Пераключыць абмежаваную шырыню зместу